КАМПЕТЭНТНА ПРА НАДЗЁННАЕ

Фота БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У час, у які хутка развіваюцца тэхналогіі, быць першымі становіцца няпроста, а гэта — неабходна. «Калі ты другі ў журналістыцы — ты ўжо дакладна не паспеў. Часам хочацца, каб нашы кіраўнікі ўсіх рангаў і ўзроўняў разумелі, што раз ёсць нейкая інфармацыя, то ёй трэба дзяліцца з журналістамі», — заўважыла Ірына Акуловіч.

У адказ кіраўнік дзяржавы заявіў: «Чыноўнікі, а асабліва міністры, абавязаны ўмець размаўляць з журналістамі. Па яго словах, «інакш невырашанымі імі пытаннямі, па якіх можна было б дасягнуць паразумення, даводзіцца займацца кіраўніку дзяржавы».

У сваю чаргу **Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі,** адзначыла, што зараз гэта пытанне пільна адсочваецца. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заклікаў уводзіць больш жорсткія «санкцыі» для тых чыноўнікаў, якія не гатовы размаўляць са СМІ. «Тузаніце так, каб было балюча камусьці. Каб усе зразумелі, што будзе непанадна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

БЕЛАРУСЬ СПАРТЫЎНАЯ

Станіслаў ЛІПСКІ, вядучы Белтэлерадыёкампаніі, падзяліўся, што нядаўна прысутнічаў на сустрэчы з параалімпійцамі і алімпійцамі, падчас якой гутарка ішла аб зімніх відах спорту. Калі паглядзець праўдзе ў вочы, то актуальная зараз сітуацыя і з летнімі відамі спорту. Тым больш напярэдадні Еўрапейскіх гульняў.

Па словах кіраўніка дзяржавы, зараз — самы час задумацца над тым, ці будзем мы надалей развіваць зімнія віды спорту, калі ўлічыць, што не так шмат увагі ўдзяляецца летнім. «Я лічу, што мы павінны захаваць як зімнюю (па відах спорту. — **«Зв».**) краіну Беларусь. І таму я анансаваў нямала будоўляў, каб можна было рыхтавацца ў любую пару года», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

ПАПРАЎКІ Ў ЗАКОНЫ

Гаворачы пра Канстытуцыю, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе законы «жывыя» і жыццё патрабуе змен. Нават калі параўнаць той час, калі прымаўся галоўны дакумент краіны, і сучаснасць, яны адрозніваюцца. Але пакуль момант для змянення Канстытуцыі не настаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «некаторыя функцыі ад Прэзідэнта павінны перайсці да іншых галін улады».

Асабліва неабходна ўзмацніць ролю выканаўчых органаў, каб некаторыя пытанні эфектыўна вырашаліся на месцах, а не толькі з удзелам кіраўніка дзяржавы.

Прагучала і тэма змен закона «Аб сродках масавай інфармацыі», якія былі анансаваны некаторы час таму. Наконт дакумента Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Калі ён да мяне паступіць, я хачу, каб вы былі задаволеныя гэтым законам».

Зараз ён яшчэ прапрацоўваецца. Прэзідэнт выказаў пажаданне, каб усе працавалі ў роўных умовах і канкурыравалі. Калі ёсць пэўны пункт погляду, можна абмеркаваць. А калі пад нікнэймамі хаваюцца тыя, хто прапагандуе нешта незаконнае, то за гэта неабходна адказваць.

ПАЛІТЫКА І ГІСТОРЫЯ

Па пытанні мемарыяла ў Курапатах Аляксандр Лукашэнка даручыў прывесці месца ў парадак. Пахаваныя жадаюць пакою, а жывыя павінны мець магчымасць прыйсці туды дзеля ўшанавання памяці. Трэба добраўпарадкаваць, прыняць рашэнне аб помніку ці іншым мемарыяле, і «на гэтым палітыка на касцях будзе завершана», падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму святкавання 25 сакавіка і адзначыў, што ролю БНР у гісторыі неабходна яшчэ ацаніць і зразумець. Сітуацыя ў той час была няпростая і неадназначная. На сёння ў нас ужо існуе Дзень Незалежнасці, які мы адзначаем 3 ліпеня, і разумеем значэнне абранай даты.

ТЭЛЕЦЭНТР БУДЗЕ, АЛЕ НЕ ЗАРАЗ

Кіраўнік тэлерадыёкампаніі «Мір» Уладзімір ПЯРЦОЎ расказаў пра казахстанскі вопыт, як у Астане пабудавалі новы комплекс для тэлеканалаў, і прапанаваў зрабіць падобны і ў Беларусі, каб ён стаў упрыгажэннем сталіцы. Прэзідэнт паабяцаў, што мы гэта зробім, але не зараз. На парадку дня правесці Еўрапейскія гульні, іншыя важныя мерапрыемствы, дабудаваць сацыяльныя аб'екты. Але гэты праект возьмуць на прапрацоўку.

Галоўны дырэктар Агенцтва тэлевізійных навін Сяргей ГУСАЧЭНКА закрануў тэму падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. Дарэчы, на журналісцкіх спецыяльнасцях першай ступені вышэйшай адукацыі зараз вучацца 1263 чалавекі ў чатырох ВНУ краіны. Па яго словах, далёка не заўсёды на практыку прыходзяць мэтанакіраваныя і кампетэнтныя студэнты. Сітуацыю неабходна аператыўна мяняць, таму Сяргей Гусачэнка прапанаваў, напрыклад, увесці журналістыку ў якасці факультатыву на іншых спецыяльнасцях.

Адказваючы на гэта, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сам калісьці думаў паступаць на журфак. Прэзідэнт пагадзіўся, што прафесія асаблівая і неабходна падбіраць тых, хто запатрабаваны ў ёй. Калі рабіць нейкія профільныя класы ці факультатывы, то гэта, на думку кіраўніка дзяржавы, справа саміх СМІ і можа працаваць па тым жа прынцыпе, як у ІТ-кампаніях. Калі **студэнтка 3-га курса Інстытута журналістыкі БДУ Лідзія ЗАБЛОЦКАЯ** адзначыла, што справа ў тым, што не хапае практыкі, Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ў жыцці не ўсё адразу атрымліваецца і, калі ёсць жаданне, а ў СМІ існуе патрэба, трэба знаходзіць перасячэнне інтарэсаў.

АД ІНТЭРНЭТ-КАРЫСТАЛЬНІКАЎ

Белтэлерадыёкампанія дала магчымасць сваім гледачам задаць пытанне Прэзідэнту. За суткі прыйшло больш за 700 паведамленняў. Аляксандру Лукашэнку агучылі самыя цікавыя. Напрыклад, спыталі, які фотаздымак для яго найбольш каштоўны. Кіраўнік дзяржавы адказаў, што і сярод асабістых, і сярод афіцыйных у яго такіх дастаткова. Гэта і здымак, як ён вучыў сына Мікалая ў хакей гуляць, і чорна-белае фота пасля першых прэзідэнцкіх выбараў. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў некаторыя з іх апублікаваць, калі гэта цікава людзям.

Безумоўна, увагі да першай асобы дзяржавы шмат, таму часам дзейнасць Прэзідэнта стварае трэнды ў інтэрнэце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што працуе не для піяру: «Піярыцца трэба на рэальным, каб менш было перабольшанняў і хлусні».

Надзея АНІСОВІЧ, Вераніка ПУСТАВІТ.

● Каментарый у тэму

Юрый ПРАКОПАЎ, намеснік галоўнага дырэктара Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі:

— Мне, як удзельніку падобнай сустрэчы ў 2004 годзе, было цікава, што падчас цяперашняй размовы ўсплыло пытанне, якое я задаваў тады. Я ўздымаў праблему, што складана ўзаемадзейнічаць з чыноўнікамі, яны не хочуць даваць інтэрв'ю, каментарыі. Тады не было ні прэс-сакратароў, ні сайтаў, мабільная сувязь толькі ўваходзіла ў наша жыццё. Як аказалася, гэтая праблема стаіць да гэтага часу. Вельмі важна, што журналісты і Прэзідэнт разумеюць яе менавіта ў кантэксце інфармацыйнай бяспекі. Калі ў нас не будзе ўзаемадзеяння на гэтым узроўні, нам будзе больш складана выходзіць на нейкія абагульненні і іншыя аспекты, звязаныя з бяспекай.

Прэзідэнт застаўся верны свайму амплуа гаваркіх адкрыта і шчыра. Ён неаднаразова падкрэсліваў, што можна дзесьці пераступіць цераз сябе, сказаць няпраўду, запусціць нейкі фэйк, але самім жа потым будзе сорамна за тое, што калісьці напісалі ці сказалі. Менавіта сумленнасць, шчырасць і справядлівасць хацеў бы бачыць Прэзідэнт у нашых рэпартажах, нашых артыкулах і працы.

Тэнгіз ДУМБАДЗЭ, вядучы АНТ, журналіст:

— Адчуванне, што адбылася адкрытая размова, дзе можна было чарговы раз убачыць перад сабой не проста чалавека, які ўзначальвае дзяржаву, а чалавека, які вельмі шмат для гэтай дзяржавы зрабіў і сабраў тут людзей, якія застаюцца ў камандзе і ведаюць, чым дыхаюць народ і краіна. Самае галоўнае тое, што для кожнага журналіста такая сустрэча шмат чаго каштуе. Мы пачулі на простай мове каментарыі да вельмі сур'ёзных рэчаў, гэта важней за ўсё, я думаю. Фармат, як мне здаецца, Прэзідэнт чакаў трохі іншы: дзесьці была скаванасць нашых СМІ, таму што не прывыклі, пераводзілі абмен меркаваннямі ў прэс-канферэнцыю. Тое, што хацеў Прэзідэнт, было б проста ідэальна, але не памыляецца той, хто не робіць нічога. Не думаю, што гэта той выпадак, калі можна сказаць «першы блін камяком», зусім не. У любым выпадку ёсць да чаго імкнуцца, і я ўжо ўяўляю, як наступны раз падобная сустрэча можа прайсці.

Уладзімір ПЯРЦОЎ, кіраўнік нацыянальнага прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір»:

— Усё прайшло на адным дыханні. Заўсёды прэс-сакратар Прэзідэнта акцэнтуе ўвагу, што сустрэча ідзе тры, чатыры гадзіны, але, непасрэдна ўдзельнічаючы ў размове, гэтага не заўважаеш. Слухаючы Прэзідэнта, здзіўляешся, наколькі глыбока кіраўнік дзяржавы, чалавек, у якога такі маштаб работы і такая колькасць праблем, паглыблены ў нашу спецыфічную тэматыку медыяіндустрыі, наколькі ён разбіраецца і адразу можа знаходзіць адказы на імправізаваныя пытанні. Я ведаю ад сваіх замежных калег, што яны высока цэняць вось гэту якасць у нашым Прэзідэнце, яна на самай справе рэдка сустракаецца. Ведаеце, у іншых кіраўнікоў дзяржаў ёсць суфлёры, маніторы, асістэнты, падказчыкі, а мы тут усе сядзелі і бачылі, што ён адразу адказвае і рэагуе на пытанні, маштабныя тэмы, якія прагучалі на гэтай сустрэчы.

Яўген ПЕРЛІН, вядучы Белтэлерадыёкампаніі, журналіст:

— Было класна, што Прэзідэнт гаварыў адкрыта, што атрымалася амаль не прэс-канферэнцыя, а сапраўды дыялог. Усё ж такі журналісты схільныя задаваць пытанні, але тым не менш пагаварылі на такія тэмы, на якія не атрымліваецца пагаварыць падчас інтэрв'ю і мерапрыемстваў, дзе ёсць магчымасць пагутарыць з Прэзідэнтам. Самая крутая эмоцыя — вельмі шмат асабістых момантаў ён расказваў, таго, што не ўсплывае ў кантэксце розных падзей.

Натуральна, ёсць сэнс пасля такога правесці «Вялікую размову», хоць гэта вырашаць Прэзідэнту. Не ўсе пытанні былі зададзены, я ўпэўнены, іх будзе больш, бо сёння мы хутчэй гаварылі аб праблемах у журналістыцы, а «Вялікая размова» значна шырэйшая.

Кірыл КАРАБАН, студэнт 4-га курса Інстытута журналістыкі БДУ:

— Мне вельмі спадабаўся такі фармат сустрэчы з Прэзідэнтам, важна, што пазвалі нас — студэнтаў, бо мы і ёсць тыя самыя будучыя кадры ў сферы журналістыкі. Мы спыталі тое, што хацелі, дадам, што журфак БДУ — гэта ўнікальнае месца, дзе збіраюцца адны з самых творчых асоб краіны. Мы згодныя з тым, што гэту сістэму атрымання ведаў можна рэфармаваць, але было б здорава, каб меркаванне студэнтаў пры гэтым улічвалася: каму, як не нам, ведаць, што канкрэтна трэба паправіць. Напрыклад, мы вельмі хацелі б бачыць у сябе больш выкладчыкаў-практыкаў. Тут было сказана, што студэнты Інстытута журналістыкі не заўсёды разумеюць, што трэба рабіць, але я ўпэўнены, што адзіныя людзі, якія маглі б нам дапамагчы, гэта і ёсць тыя самыя прафесіяналы.

Не згодны, што патрэбны толькі факультатывы па журналістыцы, бо журналіст — чалавек універсальных ведаў, таму ён павінен атрымаць вышэйшую адукацыю на базе БДУ, разам з тым гэта адна з самых практыка-накіраваных прафесій, таму нам трэба больш вучыцца ў працуючых журналістаў. Яны ў нашым інстытуце ёсць, але працуюць са студэнтамі з 3-га курса, да таго ж яны часцей вядуць спецыялізаваныя курсы. Ды і калі мы прыходзім у СМІ, нас не заўсёды сустракаюць сардэчна. Выкладчыкі-практыкі маглі б быць тым сувязным звяном паміж студэнтамі і рэдакцыямі СМІ.

Ганна ЭЙСМАНТ, вядучая спартыўных праграм Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі:

— Па-першае, я, напэўна, як і Прэзідэнт, настальгіравала па былых часах і думала: божа мой, 14 гадоў — гэта так шмат! А з другога боку, у рамках усяго жыцця гэта і невялікі тэрмін. Сапраўды, 14 гадоў таму Аляксандр Рыгоравіч быў тут у нас у гасцях, памятаю гэту сустрэчу. Я была яшчэ студэнткай факультэта журналістыкі, але ўжо працавала ў эфіры.

Сёння студэнты выказвалі сваё меркаванне, гэта вельмі важна — так блізка ўбачыць кіраўніка дзяржавы і ўступіць з ім у дыялог. Гэта ўсё рэальна. Як рэальна трапіць на тэлебачанне і працаваць тут, не толькі ў кадры. Мая гісторыя менавіта такая.

Прыемна, што сёння адбылася добрая, адкрытая гутарка. Падымаліся розныя тэмы. Мне, вядома, найбольш блізкая тэма спорту. Зараз працую над фільмам пра суверэнны біятлон, а яго ўзрост такі ж, як і ў нашай дзяржавы. Што за гэты час адбылося, чым мы можам ганарыцца, якія ў нас былі праблемы і чаму — пра ўсё гэта будзе расказваць фільм.

Ведаючы, што Прэзідэнт неабыякавы да спорту, было цікава паслухаць яго меркаванне з нагоды Еўрапейскіх гульняў, і вельмі правільна, што ён акцэнтаваў на гэтым увагу. Сапраўды, усе сілы трэба зараз кінуць, каб правесці іх на высокім узроўні. Як мы гэта ўжо ўмеем рабіць.

Шчасце, што ў нас такія форумы праводзяцца. Падчас чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе адбылося сапраўднае свята, еднасць не толькі паміж беларусамі, але і паміж гасцямі, якія прыехалі ў краіну. Гэта галоўнае. Спорт даказвае, што мы здольныя на многае. У нас ёсць сілы і ёсць жаданне.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

14 мая 2018 г. проводит открытый аукцион с условиями № 05-У-18 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на пяти земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб.
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, в районе ул. Кольцова и ул. Крамского	1,6757	Для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка в районе ул. Кольцова и ул. Крамского»	714 526,73	100 000,00	43 593,92	Отселение и снос жилых домов по ул. Кольцова, 9, по ул. Крамского, 5, 7, 14, 16, 20, 22; по Логойскому тракту, 25, корп. 3	8 290 209,82
2	г. Минск, ул. Е. Полоцкой	1,5518	Для строительства объекта «Многофункциональный культурно-развлекательный центр по ул. Е. Полоцкой»	745 497,33	110 000,00	19 110,43	Снос объектов недвижимости по ул. Е. Полоцкой, 4/8, 4/9, 4/10, 4/11, 4/15, 4/16	1 610 574,31
3	г. Минск, пр-т Дзержинского	1,3045	Для строительства объекта «Многофункциональный административно-деловой комплекс со встроено-пристроенными помещениями общественного назначения и паркингом по пр-т Дзержинского»	742 259,45	110 000,00	10 971,03	Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. 1-й Землемерной, д. 54, 56, 58, 60; ул. 2-й Землемерной, д. 57	826 026,56 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 3 104,48 руб.*
4	г. Минск, ул. Либаво-Роменская	0,63	Для строительства объекта «Административное здание с магазином, кафе и подземным паркингом по ул. Либаво-Роменской»	335 983,63	50 000,00	10 145,06	Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. Либаво-Роменской, д. 9, 11, 13, 15	603 737,10 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 2 470,31 руб.*
5	г. Минск, на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой	0,49	Для строительства объекта «Административный комплекс с подземным паркингом на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой»	263 258,99	39 000,00	9 083,34	Отселение и снос попадающих под пятно застройки зданий и сооружений по ул. Либаво-Роменской, д. 3, 5	223 889,27 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 1 981,74 руб.*

*Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и соответствующего уровня инфляции.

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **14 мая 2018 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 8 мая 2018 г. в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие "Минский городской центр недвижимости" (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:

г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 13 апреля 2018 г. по 8 мая 2018 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

**единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by